БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Сэрпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стр 1 руб.
на апошняй—50 к.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 79. Менск. Аўторак 2 ліпня 1918 г. Год

АБВЕСТКА.

Бульбяная мука уселякага роду рэквізуецца. Меньш 10 фунтаў ад рэквізыцый асвабаджаецца. Прыемная цана 40 марак за пуд.

Камэндант
НАГЭЛЬ.
Генэрал-лейтэнант.

Менск 2/VII.

Бяздольная старана.

Наш край, вытрымаўшы 2 гады фронту, анархічэскія экспэрыманты «армейскаго» сацыялізму, вырабіўся нарэшце волею палітычных судзеб і Германіі ад усіх гэтых разрываў. Нормальная работа пашла на сельскіх нівах. Зараз мы зьбярэм новы хлеб і бульбу і як нібудзь прахарчуемся. Экспэсаў у цярплівай і спакойнай нашай староны німа і ні будзе. Цэнжары ваенныя і ахвяры харчамі яна акуратна нясець.

У палітычным і гандлёвым жыцьцю за тое нейкае з Беларусі зрабілася Мертвое мора. Тым часам край, так моцна зоўрэны вайной, патрабуець жывой вады культурнаго страіцельства.

Пара ужо пырсьнуць на беларускую зямлю гэтай вады, яна зацьвіцець, як Аронаў кій. Гісторыя самадзеяцельнасьці нашай самая кароткая. Край заўсягды быў задушэны расійскім урадам. Першы краевы зьезд быў аб універсітэце у Вільне.

Першы раз усе 6 губэрній зьехаліся! Зьезд гарадоў і зямлі згаварыўся у 5 мінут. Універсытэт патрэбен, грошы дасм, каб быў самы багаты Універсытэт.

Пецярбург забараніў рабіць універсытэт. Ад універсітэта сэпаратызм інчэ больш вырасьце. Беларусам і літвінам ездзіць учыцца у Пецярбург!

У 1913 годзі быў други зьезд гандлёва-прамысловы. На ліку прачытанных рэфэратоў перанесьлі зьезды у Харкаві і Кіеві. Эканамічнае жыцьцё у зьвязку з таможэннай конвэнцыей з Гэрманіей разабралі дэтальна. Ізноў прасілі Універсытэта і Палітэхнікума.

Пачалася вайна, перасхала на нашу зямлю.

Адступаючая расійская „армія, мільёны бежанцаў, усе гэта, і людзі і коні, карміліся дарам і глумілі нашэ дабро. Страты і разорэнні па міліарды. Вынес наш народ і гэта. Рэвалюцыя, зьезды усіх вайсковых беларусаў. Зьезды вялікія усенацыянальныя. Пачытайце рэвалюцыі!

Універсытэт беларускі, палітэхнікум, школы, ахрана памятнікоў гісторыі беларускай, архіваў. Салдаты беларусы узялі пад ахрану Несьвіжскі замак. Большэвікі разагналі і арэштовывалі беларускія Рады і усе граміли.

Пакажыце нам зьезд якой другой нацыі, шэрых сялян у салдацкіх мундзірах, гдзе было такое закаханне да свае бацькоўшчыны і сьвятое ушанаванне культуры!

Палітычны тупік.

Беларусь разорвана на 3 часьці, але духам яна адна.

Гэты разрэз—яе нацыянальная беда. У XX веку гэтыя мэханічныя разрэзы німажлівы. Яны дадуць многа цяжкіх мінут нацыі. Мы лічым, што Смаленшчына, Вітэбшчына і Палессе у бліжайшыя часы злучуцца у адну нідзялімую Беларусь. Мы будзем у Заходней Эропе.

Новы наш нацыянальны урад павінен вывесьці з палітычнаго і мертваго тупіка, у каторы папала Беларусь.

Трэба паставіць точку над і. Якое нашае межнародная палажэнне? Трэба уступіць у дыпломатычныя здносіны з Цэнтральнымі Дзержавамі, Вялікарасіей, Украінай. На мейсцы трэба зарганізаваць рассеянныя нацыянальныя сілы, трэба выкарыставаць вялікі запас інтэлігэнтных сіл з усіх нацыі, жывучых у Беларусі і прызнаючых яе дзержаўнасьць. А такіх сіл у нас больш, як у якім нібудзь краю, бывшай Імпэрыі. Ні забудзем таго, што мы Заходны край, гдзе заўсягды пульс грамадзянскаго жыцьця быў моцны.

Край наш павінен трэбоваць сабе долі па заслугам сваім. Мы многа афяр зрабілі і робім у усякаго беларуса у галаве цяпер пытання: Калі-ж гэта будзе?

Агульныя весткі.

Керэнскій у Лендоне. Керэнскі быў 27 чэрвеня на канфэрэнцыі рабочых у Лёндоне і меў мову, у каторай заявіў, што рускі народ цяпер змагаецца з Турцыяй.

Мілюкоў і Гучкоў у Кіеві. Паводлуг звестак кіеўскіх газэт, у Кіеў прыбылі Мілюкоў з Гучковым, каб стаяць на чале контр-рэвалюцыйнаго руху, маючаго мэтай адбудаванне манархіі. Новая арганізацыя маець у кожным месьці атрады забезпечаныя стрэльбамі. Нават у радох чырвонай гвардыі яны маюць сваіх прыхільнікаў.

Калі-б далося вярнуць манархію главары маюць на мэці ужыць усіх высілкаў, каб вернуць назад да Расіі Украіну, Бэсарабію і Крым.

Новы плян ген. Фоша. Колькі дзен ангельскі і французкі друк шмат піщуць аб новым ваенным пляне ген. Фоша.

(Vossische Ztg.)

Большэвікі маюць большасьць у Пецярбурзі. Паводлуг апошніх вестак на перавыбарах да рады рабочых дэпутатаў большэвікі атрымалі пераважную большасьць.

ЖЭНЭВА. Згодна «Таймсу», вартасьць усіх пакрадзенных за час рэвалюцыі з майстэрняў і прыватных дамоў Пецярбургу дарагіх рэчэй і укладаў лічыцца да 18 мільёнаў руб.

БЭРЛІН. Як паведамляюць расійская газэта «Вечерніе Огни», у расію у першы раз ад пачатку вайны прыбыла почта з Гэрманіі. У добра асьвядомленых кругах лічуць гэты пачатак толькі спробай, дзеля таго што рэгулярныя пачтовыя зносіны вымагаюць ранеі цэлы рад мер, якія да гэтай пары інчэ ні былі прыняты ва ўніманне.

Масква. Камісар Урыцкі заявіў на сходзе работнікаў і красноармейцаў: газэта «Молва» выдаецца на ангельскія грошы. У Архангельску знаходзіцца англійскае бюро, каторае працуець у хаўрусе с чэхо-словацкімі вайскамі і социал-рэволюцыянэрамі. Контр-рэвалюцыянэры дасталі ад Англіі 40 міл. руб.

Z. arm X.

Ангельйская рэспубліка Ледавітаго Акеану зроблена Англіей на аснове самаазначэння нацый у паўночнай Расіі.

Z. arm. X.

Контр-рэволюцыя у Сыбіры. Савет с Владывастоку паведамляець, што вайскі Семенова разбіты у Забайкалле і адціснуты у Манджурыю.

Палкоўнік Семеноў, па вядомасьцям Говала, адбіў ад Харбіну большэвікоў пасьля трыдцеўнаго боя.

З Красноярску выгналі большэвікоў.

Голад у Пецярбургу, як пішэ „Times“, за астатнія 3 дні чэрвеня пе выдавалі ні хлеба ні бульбы. Людзі ядуць шалупіны бульбы. Мужчыны і кабеты падаюць на вуліцы ад голаду. Работнікі з аружжэм едуць на вескі шукаць хлеба. Пры гэтым бываюць бойкі. Адзін раз забілі 57 рабочых.

Z. arm. X.

Соцыялізацыя жыта. Камісар юстыцыі выраблнець закон, па катораму усе жыто і мука будзе абяулена уласнасьцю дзержаўнай.

Крымская рэспубліка. Татарскі урад скінут, са слоў «Новай Ж.», у галаве новаго праўлення стаў рускі генэрал Дункевіч.

Z Arm. X.

Суды над царскімі міністрамі. Большэвікі збіраюцца судзіць царскіх міністроў. Першаго будуць судзіць б. міністра юстыцыі Шчэглавітава за націск на судзей, каторыя судзілі у Кіеві Бэйліса.

Бэсарабія. Украіна заявіла, што калі Бэсарабія далучыцца да Украіны, то яна дастане поўнае самаўпраўленне.

Весткі з Расіі.

5-й Усерасійскій зьезд саветаў.

Як паведамляюць «Новыя вѣдомости», 5-й усерасійскі зьезд саветаў пазначаны на 28 чэрвеня, пераносіцца на 3 ліпня.

Па заяве Троцкаго, дным з глаўных пытанняў а зьездзі мае быць харчова пытанне. «Мы чэкаем паслухаць ад усерасійскаго зьезда яснай заявы, што ніякіх зьмен у харчовай савецкай палітыцы быць ні можа. Трэба разсеяць фальшывыя падзеі кулакоў і спэкулянтаў на мажлівасьць адмены хлебной мананоліі».

Другім заданнем зьезду мае быць пытанне аб стварэнні арміі. «Зьезд павінен сказаць чырвонаармейцам, што яны пастаўлены у лепшыя харчовыя варункі ні дзеля таго, каб лодэрнічаць, граць у карты і мець зьвязі з мяшэчнікамі. Слабасьць ваеннаго кустарніцтва мейсцовых саветаў выявілася значна пры чэхо-славацкім выступленні».

Арэшт А. В. Амфітэатрова.

24 чэрвеня у ночы быў арэштованы А. В. Амфітэатроў. У яго памешканні рабілі обыск і забралі перэпіску, рукапісы і дакумэнты. Пасьля обыска Амфітэатраў быў дастаўлены у надзвычайную сьледственную камісію па барацьбе с контр-рэвалюцыяй, на Гороховую, 2.

Перад адпраўкай па Гороховую Амфітэатраву казалі ўзяць с сабою бялізну, вопраткі і харчы.

Зачыненне газэт.

У Маскве апрача «Новой Жизни» зачынены газэты «Возрожденіе» і меньшэвіцкі «Нашъ Голосъ» і «Новое Дѣло Народа».

У Пецярбурзі зачынены газэта «Молва». У прыказе сказано так: «Даручаецца таварышу Артемьеву зрабіць вобыск зачыніць газэту «Молва». Стэоратып разбіць, шрыфт раскідаць і супрацоўнікаў арэштаваць».

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Завабіло, задзівіло, заваро-жыло, заняволіло ты мяне, пахучае жытняе поле!..

Каласы твае гудуць, шумяць, шэпчуцца, калышуцца пад ветрам па раскіданых у шыр і у доўж селянскіх шнурах...

О, жытняе поле! Хай каласы твае заплюшчуць мне вочы, хай забаўляюць мяне, цалуюць мой твар; хай абсыпяць мяне ўсяго дажджом сваіх сьвежых, стромкіх сцвалкроў і гавораць мне свае адвечныя казкі...

Я браджу паміж тваіх высокіх сьцен па мяжох у гарачы поўдзень. Каласы выхіляюць у маю старану свае лебядзіныя шыйкі і з ветласьцю кланяюцца мне. Васількі чалом бьюць мне на спатканне.

Чмялі гудуць. Мятлічкі кружацца. Сонейко з верху льець свае праменні ні [ш]кадуючы і выціскае мядовы хмель з жывых грудзей зямлі і атуляе і апьяняець усіх жывых стварэняў пад набам...

Моро жыта пакрываецца пазалотаю, блішчыць, і пераліваецца рознымі колерамі і сьлепіць вочы сваім бязмежным абшарам...

Сэрцо радуецца і нарадавацца ні можа...

* * *

Гэтай самай мяжой, дзе я браджу, над жытнім полем падсовываецца мне напроціў галава чалавека. Бліжэй і бліжэй, вочы чалавека глядзяць на мяне сумна усьміхаючыся і я пазнаю Сымона с пад N., гэтаго вечнаго батрака і бязхлебніка. Гэты добры сталяр у самыя лепшыя часы прапіваў, заработкі свае і жыў заціркай а за час вайны ён перастаў піць і зажыў гаспадаром. Нажыў кароўку, сьвінцо і тое ды сёе.

— Пахвалёны!

— На векі векаў!

— Куды ідзеш?—пытаюся, угледзіўшы у яго парожні мяшок у руцэ.

— А я іду да палясоўшчыка N., кажуць.—у яго ёсьць жыто на прадаж па 60 рб. за пуд. Быў я у Крайску на рынку, быў і у Даўгінаве, быу у рознай шляхты—німа ды німа. А тут мукі нават і на заціркy бракуе.

Мы ішчэ пагутаралі аб тым ды аб сім і я павярнуў у другі бок ды пайшоў з ім разам. Гэдак трэба было ісьці вярсты дзьве ад поля пад самы лес на пагорак. Мы мінулі поле жытняе і на мосьце, [о]каля млына, ужо угледзілі хату палясоўшчыка, дзе с коміна віўся у верх сіневаты дымок. Далей мы павярнулі [з]па цянкі, шлі проста камяністым дзерваном або межамі, абыходзючы бульбяныя поля.

«Выпьем чарку, выпьем дзьве,
Каб шумело у галаве»...

Пачулася нам з гуменцаў палясоўшчыка заліхвацкая вясёлая прыпеўка. Гэта пеў грубы бас троху с хрыпоткай, нібы надрываючыся.

«Выпьем тут, выпьем там,
Засьпеваймо тум-ты-ды-рам»

падхопліваў маладзы задорны галасок хлапчука—падростака.

Сымон пацягнуў носам. Я ціскаў плячыма ад дзіва. — Дык жа-ш тут гарэлку пьюць, бэстыі!—з зайздрасьцю выгаварыў Сымон, ударыўшы сабе пальцам у лоб.

— Ма быць пьюць,—згадзіўся на гэта і я.

Як прыйшлі мы на гуменцы то угледзілі такі абразок:

Стары палясоўшчык, чалавек цяжкі, тоўсты, без шапкі у адной расхрыстанай[] кашулі, босы, трымаючыся зухавата у бокі, скачыць казачок у прысядкі: Потная лысіна блішчыць пад сонцам, а рыжая барада сьмешна трасецца. Проціў яго ўюнам кружыцца яго сын падростак. Абое добра выпіўшы. Пяюць песьні, і ім, мабыць, моро па калено. Водаль пад страхою, побач с пустою калодай ад пшчол, стаіць «нічыстая сіла»—бачопак саматушкі. Вось дзе той электрычны матор, каторы круціць, як самую хітрую машыну, бацьку с сынам! Доўга яны нас ні прыкмецілі.

Мы с Сымонам зарагаталі ад усей душы. Тут толькі яны адвярнуліся у наш бок.

— А-а, госьцікі! просімо міласьці да нас, ягамосьцікі! —самым наймілейшым голасам зьвярнуўся да нас палясоўшчык, выціраючы рукавом кашулі свой потны лоб—гэй, Янэчка, сынок, азьмі-тка, дзеткі, кансэрвачку, пачастуй паноў гарэлачкай!

Хлопец дастаў с пад калоды блішанку ад кансэрваў і падставіўшы пад бочку, давай ліць у яе.

Сымон прырваўся да «кансэрвачкі» самым грунтоўным спосабам, а я дэлікатна адмовіўся ад гэтаго пачастунку. Тым часам выскачыла бурай с хаты гаспадыня ды пачала сыпаць гаспадару:—А ты сякі, ты такі! каб табе сёе, каб табе тое! ішчэ добрых людзей зводзіш гарэлкай сваёй, як табе ні сорамна, добры мой, гаспадару! Во ужо дзякавапь Богу, трэці дзень як пьець добры мой гаспадар. Зараз па трыста рублёў гарэлкі выпьець, губнік ты! лайдацюга!

— Маўчы, сука! Ты ішчэ гаворыш?—зараўеў на сваю жонку палясоўшчык,—а чыя была гутарка: азьмі вось пару пудоў жыта ды пусьці на гарэлку! Ні ты мне, сука, так раіла? і палясоўшчык вытарашчыў на яе свае гнеўныя вочы.

— Каб ты, губнік мой, толкам прадаў гэту гарэлку, як вун суседзі твае, дык было-б грошы, а цяпер во, фігу мець будзеш, лайдацюга!

— Ты вінавата!

— Ты сам вінават!

— Дзе дчорт сам ні патрапіць, туды бабу пашле.—ні мог стрымацца Сымон і моў за гэта ад гаспадыні добраго паганяю. За тое, пахваліў яго палясоўшчык і давай шчыра частаваць.

З нейкім сумам на душы пайшоў я аттуль адзін. Шоў я дзірваном, потым дабраўся да жытняго поля. Гэта уся сцэна здалася мне нейкім сном, ніпадобным да праўды у цяперашнік часох.

* * *

А назаўтра ужо усе ваколічныя вёскі ведалі, што Сымон пьянстваваў усю ноч у палясоўшчыка, нейдзе згубіў свае 60 руб., чуць лі ні ракам прывоўз ён да хаты пьяны. Жонка яго здорава біла за тое, што сямью без заціркі аставіў...

Падарожны.

Расійскае дзержаўнае упраўленне у новаакупаваным районе 10 арміі знаходзілася пры ўступленні нямецкіх войск у стану паўнейшаго безпарадку. Главнае сільна былі разстроены фінансавыя варункі, дзякуючы піумеламу гаспадараванню, адмені праў уласьнасьці, распыленню гаспадарскіх сіл краю, нідахвату аўтарытэта установаў і паўнейшаму нідаверыю насялення. Опытныя чыноўнікі былі спыняны або без пэнсіі. Кассы былі пустыя. Уся налічнасьць, нават грошы, паложанныя на зьберажэнні, былі цалком забраны уцекаўшай чырвонай гвардзіяй.

Дзякуючы ніўтамімай працы нямецкіх ўласьцей, удалося нарэшці перэмагчы хаос і стварыць грунты дзеля ўстаноўлення і ўзмацавання упарадкаванаго ладу. Шмат дала у гэтым напрамку, побач з учасьцем мейсцовых ведаючых асоб, праца рускаго чыноўніцтва. Прыцягнуць да гэтай працы можна было толькі обязпечыўшы істнаванне работнікаў. На гэта патрэбны былі грошы.

Вялікай заслугай Гэрманіі ёсьць тое, што яна абязпечыла край грашмі, даўшы пазычку у 1.000.000 марак без ўселякаго пад яе абезнячэнне, дзеля таго каб зноў наладзіць упраўленне краем.

Такім чынам маглі быць пакрыты самыя патрэбныя выдаткі, главнае выплачэны прыбаўкі на дарагоўлю да ранейшай пэнсіі чыноўкаў.

З зваротам парадку даверье насялення зноў вярнулося і гаспадарскае жыццё увайшло у сваё русло.

Гэто выяўляецца у растучым паступленні налогаў у рускія казначэйстві. С павялічэннем налічных грошай, пытанне аб выкарыстанні іх зрабілося настаяцельным. Раней яны напраўляліся у расійскі дзержаўны банк. Цяпер гэта мажлівасьць адпала. З другога боку налічнасьць павінна быць у інтэрэсах краю, с прычын пастаяннаго падзення курса рубля, абаронена ад абезцэнення; было б нівыбачна і шкадліва для краю, ні даць гэтых капіталаў у рост.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоўнаг[о] камандавання за 30 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

На баевых вучастках паўночней рэкі Ліс і паўднёвай рэ[кі] Эн увесь дзень прадаўжалася узвышаная артылерыйска[я] дзеяльнасьць. У вечары яна ажывілася і на фронці паміж Ізэрам і Марнай. Пізначыцельныя пяхотныя бэі. У часе сіл[ь]ных варожых націскау паўднёвей Урсі і вашаго усьпешна[га] прэдпрыімства у Гартманвейлерскайфа мы узялі палонных.

Лейтэнант Удэт меў сваю 36, лейтэнант Левенгардт сва[ю] 31 перамогу у паветры. Лейтэнант Якобс за апошнія д[ні] зьбіў сваіх 21-го і 22-го праціўнікаў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**

Выход з гэтаго прэпонавау аддзел «Усходнай Пазычковай Кассы» (Дарлепскассэ Ост), які выход ужо прыняты мейсцовым упраўленне па апрэдзяленню нямецкіх уласьцей. Упраўленню адчынены у у гэтай кассе рахунак, на які яна можэ укладываць, маючыеся—пад яго загадам капіталаў у пэўны рост, маючы мажлівасьць у выпадку патрэбнасьці ва уселякі час узяць іх аттуль.

Трэба спадзевацца, што гэта мера, служачая толькі інтэрэсам краю, шмат паможа аздараўленню мейсцоваго фінансавога становішча.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Тавараабмен. Пры нямецкім градоначальстве ад 27 чэрвеня пачау функцыянаваць тарговы аддзел. Мэта адчынення—установлення тавараабмена (абуві, гэрбаты, мыла, мануфактуры і др.). Паміж Менскам і Вялікарасіяй з Украінай. Аддзел мае арганізаваць як найшырэй справу закупак рэчэй першай патрэбнасьці і як найхутчэй даставіць іх у Менск, дзеля адпуска насялённю па цьвердых цэнах.

Зьменьшэнне хлебнаго пайка. Харчавы аддзел нямецкаго градоначальства, кіруючыся мэтай дацягнуць са старымі мучнымі запасамі да новаго ураджаю, рэшыу хлебны паек на бягучым тыдні зьменьшыць ад 3-х фунтау на $2^{1}/_{2}$ ф. на порцію.

Упрауленнем Л. Р. ж. д. таксама зьменьшана штодзенная норма хлеба да 1 фунта на кожнаго агэнта, замест ранейшых $1^{1}/_{4}$ ф.

Перэдаюць з Молодэчно, што там харчовая справа ж. дар. служачых стаіць троху лепей.

«Тыдзень апекі», адбыушыся ад 5-го па 20-е мая, гэтымі днямі падвеу свае падракункі. Прыбытку чыстаго аказалася усяго толькі 6,806 р, 18 к.

«Беларуская Хата». Акружным судом пацьверджана устава «Беларускай Хаты», што на конным пляцу.

Пры клюбу у хуткім часе адчыняецца сталоука.

Рэгістрацыя бонавых кніжак. Дзеля скасавання бонавых кніжак асоб выбыушых з Менску, ад учэрашняго дня, г. з. ад 1-го ліпня, пачата агульная праверка праз 5 бонавых бюро. Для дзержацелеу кніжак 1-ай часьці места—бонавае бюро на Юраускай вуліцы. Для 2-ой часьці — Саборн[ы] пляц, № 4. Для 3-ай часьці [—] рог Захараускай і Доугабро[д]скай, № 153, 4-ай часьці—Ко[]ломенская, 19, 5-ай часьці—Восирэсенскі завулак, фабрык[а] Эпштэйна.

Кожны уласьнік бонаво[й] кніжкі павінен яуляцца у бюр[о] з дамавой кнігай і дакумэ[н]там, па якому ен быу прап[і]саны.

Па аканчанні праверкі б[о]навыя бюро напрауляюць р[э]гістрацыйныя лісты у належ[ныя] чыя крамы.

Асобы, ні выпауніушыя г[э]тых вымаганняу, трацюць пр[а]во на атрыманне прадуктау.

Купчыя крэпасьці і іншь[ія] акты ад учэрашняго дня, г. [з.] ад 1-го ліпня, дазволена р[a]біць ва усіх меясцавых нат[а]рыяльных канторах на грун[це] нідаунаго загаду глаунакама[н]дуючаго X арміі.

У губэрнскім казначэйст[ві] 28-го чэрвеня нямецкімі улас[ь]цямі была зроблена правер[ка] грошавых дакумэнтау і сум[,] усе знойдзено у поуным п[а]радку.

Грошы царскімі і «керэ[н]камі» у сумме 350,000 руб. п[а]ступілі у распараджэнне н[я]мецкіх уласьцей пад чэкаву[ю] кніжку на імя казначэйств[а]. На бягучыя апэрацыі аста[в]ляны акупацыйныя грошы.

Сэсія акружнога суда з учас[ть]цем прысяжных заседацел[яў] пачалася учора, 1-го ліпн[я] закончыцца—5-го ліпня. Уся[го] назначано да слухання [] угалоуных спрау з іх адно п[а] абвінаваценню Гэнрыха Ласк[і] у убіустве Ушакова.

У губэрнскім прысуцтвіі чар[]говае судзебнае пасяджэнн[е] адбудзецца у пятніцу 5-го лі[п]ня. Назначано да слухан[ня] 100 грамадзкіх спрау.

У земстві. Ад учэрашняг[а] дня, г. з. ад 1-го ліпня, у Мен[]ску губэрнскім земствам ад[]чынены пэдагогічныя курс[ы] для вучыцелеу еурэйскіх па[]чатковых школ. Заняцці пра[]цягнуцца да 1-го кастрычнік[а]. Абучэнне дарэмнае. Для кур[]сыстау арганізаваны дарэмн[ы] прыпынак і па мажлівась[ці] танныя абеды. На стыпэнды для бедных слухачоу асіг[]навано губ. земствам 2,500 р[.]

Адсрочка плацежоу на вэк[]селях і чэках. Пастановай глау[]накамандуючаго X арміі а[д] 22 чэрвеня плацежы на вэк[]селях і чэках, канаючыхс[я] срокам да 10 чэрвеня уклю[]чыцельна, будуць пакуль ад[]срочаны да 10/I—1919-го год[а] уключыцельна.

Пастанова гэта мае моц н[а] вобласьці акупаванай X ар[]мыяй.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынбпята.